**П.А.Гуд,** *прафесар*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ПІРАТЭХНІКА Ў СВЯЦЕ”

Кафедра рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў рыхтуе спецыялістаў у галіне святочнай культуры па спецыяльнасці “рэжысура”, у рамках якой ужо на працягу дзесяці гадоў ажыццяўляецца выкладанне дысцыпліны “Піратэхніка ў святе”. Гэта абумоўлена тым, што на сучасным этапе перад дзеячамі культуры і мастацтва востра паўстала праблема развіцця святочнай культуры Беларусі, пабудаванай на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны.

Адным з яскравейшых фрагментаў беларускіх свят мінулых часоў былі разнастайныя вогненныя і вогненна-піратэхнічныя дзействы і феерверкі, якія з’яўляліся кульмінацыйным момантам або фіналам свята. Этнаграфічныя і літаратурныя матэрыялы пераканаўча даказваюць, што феерверкі (рознакаляровыя дэкаратыўныя агні) на тэрыторыі Беларусі маюць багатыя мастацкія традыцыі. Таму вывучэнне, асэнсаванне і развіццё мастацкай спадчыны, увядзенне ў пералік дысцыплін спецыяльнасці “рэжысура” курса “Піратэхніка ў святе” мае практычную неабходнасць, з’яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

Дысцыпліна “Піратэхніка ў святе” ставіць мэтамі вывучэнне феерверачных традыцый беларусаў і народаў сусвету, агульных заканамернасцей развіцця піратэхнічнага мастацтва і яго рэгіянальных асаблівасцей, раскрыццё шляхоў удасканальвання сучасных свят на аснове культурна-гістарычнай пераемнасці.

Праграма навучання прадугледжвае знаёмства з гісторыяй развіцця феерверкаў на тэрыторыі Беларусі; набыццё ведаў па тэхналогіі вырабу піратэхнічных фігур; авалоданне методыкай стварэння сцэнарыя феерверка, а таксама плана яго матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння; здзяйсненне сцэнарна-рэжысёрскай распрацоўкі піратэхнічных дзействаў дыпломнага свята студэнта.

Вывучэнне курса заканчваецца залікам. Да заліку студэнт рыхтуе сцэнарый і пастановачны план феерверка дыпломнага свята,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малюнкі, эскізы і чарцяжы піратэхнічных фігур, а таксама адказвае на адно з тэарэтычных пытанняў.

Навукова-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны здзяйсняецца наступным чынам. На кафедры распрацаваны вучэбна-метадычны комплекс па курсе "Піратэхніка ў свяце", у які ўваходзяць вучэбная праграма, вучэбны дапаможнік (у электронным варыянце), курс лекцый (у электронным варыянце), метадычныя ўказанні, змест і патрабаванні да практычных і індывідуальных заняткаў; пералік пытанняў і патрабаванняў да заліку; спіс літаратуры. Дадатковымі матэрыяламі вучэбна-метадычнага комплексу з'яўляюцца малюнкі феерверкаў, чарцяжы і тэхналагічнае апісанне піратэхнічных фігур, партрэты выдатных пірамайстроў розных часоў. Вучэбна-метадычны комплекс, вучэбны дапаможнік і курс лекцый у электронным варыянце знаходзяцца таксама ў электроннай бібліятэцы БДУ культуры і мастацтваў. Навуковая і метадычная літаратура па дысцыпліне ў дастатковай колькасці знаходзіцца ў бібліятэчных фондах нашага ўніверсітэта, а пры неабходнасці студэнты звяртаюцца да матэрыялаў бібліятэк г. Мінска.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу студэнтамі, у мэтах навукова-метадычнага забеспячэння працэсу навучання па гэтай дысцыпліне на кафедры актыўна ўжываюцца мультымедыйныя сродкі – прагляд і аналіз тэхналагічнага рашэння розных піратэхнічных вырабаў, фігур, мастацкіх кампазіцый.

Значную цікавасць студэнтаў выклікае прагляд відэаастужак міжнародных, рэспубліканскіх і іншых фестываляў феерверачнага мастацтва ў Беларусі, Расіі, Літве, Італіі, Германіі, Швецыі, Кітаі. На гэтых узорах рэжысёрскага майстэрства студэнты спасцігаюць вобразнае ўвасабленне дзейства і яго адлюстраванне ў мастацка-дэкаратыўным, музычным і, часам, у пластычным вырашэнні.

Вялікую метадычную каштоўнасць для студэнтаў у тэарэтыка-практычным асваенні прадмета маюць лепшыя аўтарскія сцэнарна-метадычныя распрацоўкі феерверкаў студэнтамі – дыпломнікамі мінулых гадоў. У гэтых работах, якія былі ўвасоблены на святах у многіх раёнах Беларусі, канкрэтна і наглядна праглядаюцца ўсе этапы і асаблівасці ўвасаблення пэўнага піратэхнічнага дзейства. Такія аўтарскія распрацоўкі з'яўляюцца метадычнай асновай для стварэння новых феерверачных дзействаў студэнтамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з метадычных формаў прафесійнага навучання рэжысёраў па дысцыпліне “Піратэхніка ў свяце” з’яўляецца работа над творчымі дакладамі па розных творчых і арганізацыйных аспектах піратэхнічнага дзейства. Падрыхтоўка даклада дае магчымасць студэнту больш глыбока разгледзець тое ці іншае пытанне, павысіць тэарэтычны ўзровень, выкарыстоўваць матэрыялы ў далейшай рабоце. Адным са шляхоў метадычнага забеспячэння прафесійнай падрыхтоўкі з’яўляецца шматгранная і плённая работа выкладчыкаў і студэнтаў па арганізацыі і правядзенні свят, на якіх выкарыстоўваюцца феерверкі, у выніку чаго распрацаваны матэрыял стаў прымяняцца не толькі ў дзейнасці навучальных і культасветустаноў Беларусі, але і ў тэарэтычнай і практычнай рабоце студэнтаў іншых спецыялізацый, а таксама на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУ культуры і мастацтваў.

Кафедра рэжысуры абрадаў і свят падтрымлівае цесную сувязь з Міжнародным саюзам развіцця феерверачнага мастацтва “Спецэфект плюс”.

На міжнародных канферэнцыях гэтага грамадскага аб’яднання заўсёды прысутнічаюць, а часам выступаюць з дакладамі студэнты кафедры. Гэта дае магчымасць студэнтам не толькі пазнаёміцца з лепшымі прадстаўнікамі старажытнай “вогненнай” прафесіі, праглядзець відэаўзоры сучаснай піратэхнікі, але і прыняць да ведама яе праблемы і шляхі далейшага развіцця.

Разам з тым, згодна папярэдняй дамоўленасці кафедры рэжысуры абрадаў і свят з Міжнародным саюзам, студэнты па-за межамі навучальнага працэсу самастойна праходзяць назіральную практыку, у час якой яны пасля адпаведнага інструктажу дапускаюцца на піратэхнічную пляцоўку, назіраюць, якім чынам адбываюцца дастаўка, прасторавы падзел і мантаж піратэхнічных фігур, падрыхтоўка да работы піратэхнічных зборак, усталяванне ракет, люсткугеляў, і знаёмяцца непасрэдна з самім піратэхнічным дзействам. Гэта практыка выклікае інтарэс у многіх студэнтаў, а лепшыя з іх пасля тэарэтычнага і практычнага экзамену перад майстрамі-піратэхнікамі дапускаюцца кафедрай і Саюзам да самастойнай вучэбнай практыкі пад наглядам піратэхнікаў-інструктараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навукова-метадычныя падыходы кафедры рэжысуры абрадаў і свят да навучання студэнтаў па дысцыпліне “Піратэхніка ў свяце” ўжо далі свой плён: многія выпускнікі кафедры працуюць рэжысёрамі феерверкаў і піратэхнікамі-дэманстратарамі ў Міжнародным саюзе феерверачнага мастацтва “Спецэфект плюс” і піратэхнічных фірмах абласных цэнтраў Беларусі. Дзякуючы іх намаганням за апошнія гады значна вырас якасны ўзровень беларускіх феерверкаў. Многія выпускнікі, якія працуюць у сферы піратэхнічнага мастацтва, і студэнты за распрацоўку і ўвасабленне феерверкаў на святах атрымалі ганаровыя дыпломы міжнародных фестываляў, напрыклад Ю.Мікалаеў, В.Баранава, Ю.Аляхно, А.Мацко, В.Монцік, Т.Кухта і інш. Галоўная праблема выкладання курса – малы аб’ём гадзін, адведзеных на асваенне дысцыпліны, а таксама адсутнасць спецыяльнай лабараторыі піратэхнічнага мастацтва.


1. *Гуд, П.А.* Огненная симфония / П.А.Гуд. – Дзержинск, 1999.

2. *Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята / П.А.Гуд. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2006.

3. *Гуд, П.А.* Мастацтва феерверкаў / П.А.Гуд. – Мн.: Мэджык БУК, 2007.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ